***Вікторыя Дзянісенка***

# СПЕЦЫФІКА ЗАХАВАННЯ ЗАМОЎ<br>У ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ БДУ

Замова – гэта асобны фальклорны жанр, які разглядаецца як пэўная разнавіднасць рытуалу. Узрастаючае культурнае значэнне замоўных матэрыялаў можна патлумачыць іх невялікай распаўсюджанасцю і колькасцю (у параўнанні з іншымі фальклорнымі жанрамі), складанасцю іх фіксавання і захавання, што тлумачыцца своеасаблівым характарам бытавання твораў гэтага віду, паколькі носьбітамі замоў з’яўляюцца «прафесіяналы» (вядомы ў народзе пад назвай «бабка», «шаптуха» і інш.), якія па тых ці іншых прычынах адмаўляюцца паведамляць сакрэты сваіх магічных дзеянняў [2, *38*] і, на вялікі жаль, паступова сыходзяць з жыцця.

Вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ (далей – ВНЛБФ) функцыянуе з 2005 г. За гэтыя гады яе супрацоўнікамі былі распрацаваны «розныя віды і формы работы, якія тычацца арганізацыі <…> архіўнай дзейнасці» [1, *320*].

Замоўныя творы ў ВНЛБФ знаходзяцца ў рэгіянальным, жанравым, фота-, аўдыёархівах і ў камп’ютэрнай базе данных рэгіянальнага архіву, праца ў якіх ажыццяўляецца ў залежнасці ад умоў, спосабу захавання і карыстання неабходнымі матэрыяламі.

У рэгіянальным архіве замовы захоўваюцца ў рукапісным варыянце разам з творамі іншых фальклорных жанраў, улічваючы рэгіянальным прынцып іх фіксавання (па абласцях). Для зручнасці карыстання і пошуку папак з замовамі трэба карыстацца створаным электронным варыянтам ведамасцей рэгіянальнага архіву ў праграме Excel, у якім адлюстроўваюцца звесткі пра інфарманта, збіральніка, год, месца запісу замовы, а таксама пра колькасны і жанрава-відавы склад усёй папкі, у якой знаходзіцца замова. Такім чынам, наведвальнікі ВНЛБФ з тэкстамі замоў могуць пазнаёміцца ў рукапісным выглядзе, а таксама з дзённікамі фальклорных практык студэтаў-практыкантаў, у якіх шмат цікавых дадатковых звестак, напрыклад, пра замаўляльніка, час, асаблівасці самаго працэсу замаўлення і інш.



**Малюнак 1 – Інтэрфэйс базы дадзеных фальклорных адзінак**

Не выклікае сумнення, што аўдыё- і відэазапісы маюць вялікую каштоўнасць для захавання аўтэнтычнага фальклору, і ў прыватнасці замоў, калі ўлічыць цяжкасці іх фіксавання. На вялікі жаль, відэазапісаў збору замоў у ВНЛБФ не захоўваюцца, а аўдыёзапісы асобна знаходзяцца ў аўдыёархіве і размяшчаюцца па рэгіянальным прынцыпе (па абласцях). Першапачаткова супрацоўнікамі лабараторыі яны расшыфроўваюцца (праслухоўваюцца), а потым апісваюцца па прынятых крытэрыях для складання інвентарызацыйных ведамасцей і вопісаў для саміх аўдыёносьбітаў [1, *326*]. Для зручнасці карыстання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і пошуку аўдыёзапісаў замоў трэба карыстацца электронным варыянтам інвентарызацыйных ведамасцей у праграме Excel, у якім адлюстроўваюцца звесткі пра інфарманта, збіральніка, год, месца запісу замовы, а таксама пра колькасны і жанрава-відавы склад усёй аўдыёкасеты, на якой запісана замова.Так, на сённяшні дзень у ВНЛБФ захоўваюцца аўдыёзапісы замоў з 1998 г., сярод якіх большая колькасць запісаў лекавых замоў.

У жанравым архіве замоўныя матэрыялы, зафіксаваныя на картках, былі сістэматызаваны па відах і захоўваюцца ў скрынях з паметкай «Замовы», у якіх знаходзяцца адпаведна функцыянальна-тэматычнага прынцыпу. Сярод іх наступныя: замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (гаспадарчыя, ад звяроў, ахоўныя і інш.), лекавыя, замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі (вясельныя, замовы ў дарогу, ад злых людзей, ад уроку і інш.), любоўныя і інш.

Цікавыя і даволі рэдкія замоўныя матэрыялы захоўваюцца ў фотаархіве ВНЛБФ у выглядзе фотакніг замоўных тэкстаў і матэрыялаў, прысвечаных ім даследаванняў. Пералічым некаторыя: «Сборникъ Харьковскаго историко-филологического общества» (Том 16-й, Харьковъ, Типографія Губернскаго Правленія. Петровскій пер., д. №17-й, 1897. С. 1 – 65), «Заметки по литературе и народной словесности» (академика А. Н. Веселовского, I, Приложение къ XLV–му тому Записокъ имп.Академии наукъ. №3, Санктпетербургъ, 1883. С 87 – 95), «Знахарь. Варшавскія университетскія известія» (№3, 1876. С. 3 –59), «Сборникъ малороссійскихъ заклинаній» (составилъ П.Ефименко, Изданіе Императорскаго Общества Исторіи и Древнойстей Россійскихъ при Московскомъ Университете, Москва, 1874. С. 1 – 70), «Заговоры, заклинанія, обереги и другие виды народнго врачеванія, основанные на вере въ силу слова (Изъ исторіи мысли)» (Вып. 1, Варшава, Типографія Варшавскаго Учебнаго Округа, 1900. С. 7 –126 ).

Улічваючы тое, што студэнты за апошні час здаюць справаздачы па фальклорнай практыцы ў электронным выглядзе, а таксама імкненне да абагульнення звестак пра інфармантаў, збіральнікаў, самі фальклорныя творы і прадстаўленне іх ў сціслым і адначасова прыдатным для чытання і аналізу выглядзе, у 2009 г. супрацоўнікамі ВНЛБФ БДУ былі створаны базы данных на аснове матэрыялаў рэгіянальнага і жанравага архіваў ВНЛБФ БДУ, якія функцыянуюць з дапамогай праграмы СУБД (сістэмы ўпраўлення базамі дадзеных) Access 2003. На сённяшні дзень у ёй захоўваецца 3430 фальклорных адзінак.

Аснова баз данных складаецца з трох табліц, якія прадстаўляюць інфармацыю, з аднаго боку, пра фальклорныя творы рэгіянальга і жанравага архіваў («Твор»), з другога – пра выканаўцу («Інфармант») і з трэцяга – пра збіральніка («Збіральнік»).

На дадзены момант у базе данных ВНЛБФ захоўваецца 69 замоўныя адзінкі, з іх па вабласцях: 6 – у Мінскай, 12 – у Магілёўскай, 18 – у Віцебскай і 33 – у Гомельскай.

Для эфектыўнага доступу да данных і больш зручнага пошуку фальклорных твораў патрэбнага жанру і неабходнай пра іх інфармацыі, якая захоўваецца ў табліцах, былі створаны запыты. Так, пошук замоў у базе данных можа ажыццяўляцца з дапамогай запыту «Жанр», прыклад якога прыводзім ніжэй для базы данных Гомельскай вобласці.

Такім чынам, з дапамогай запыту «Жанр – Замова» мы атрымліваем інфармацыю па наступным крытэрыям: з табліцы «Твор»: уласна тэксты замоў, месца і раён іх запісу; з табліцы «Інфармант»: прозвішча, імя і імя па бацьку, год нараджэння, нацыянальнасць, адукацыя інфармантаў, якія паведамілі замовы; табліцы «Збіральнік»: прозвішча, імя і імя па бацьку, курс, спецыяльнасць збіральнікаў, якія запісалі замовы, год іх запісу, а таксама вобласць вопісу, вопіс, № папкі ў архіве, у якой захоўваюцца замовы.

Для захавання як мага больш звестак пра «бабак», замоўную традыцыю, умовы замаўлення і інш. ў той ці іншай мясцовасці, аўтарамі метадычнага дапаможніку «Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік» для студэнтаў I курса філалагічнага факультэта БДУ (Мінск, 2009) Р. М. Кавалёвай, В. В. Прыемка, Т. А. Марозавай быў складзены апытальнік для збору замоў [2, *38 – 40*].

Падводзячы вынік, пазначым, што ў ВНЛБФ надаецца вельмі важнае значэнне захаванню замоўных твораў. Апрача класічнага – рукапіснага – выгляду захавання гэтых матэрыялаў, у працу пачало ўкараняцца і электронны. Тым самым гэта дае надзею, што сабраны каштоўнейшы матэрыял замоў не знікне.

**Спіс літаратуры:**


1. Марозава, Т.А. Арганізацыя архіўнай работы ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ / Т.А. Марозава // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. Вып. 7 / пад навук. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2010. – С. 320 – 329.
2. Фальклорная практыка: метадычныя рэкамендацыі і праграма-апытальнік: для студэнтаў I курса філал. фак. па спец. 1-21 05 01 «Беларуская філалогія», 1-21 05 02 «Руская філалогія», 1-21 05 04 «Славянская філалогія» / Р.М. Кавалёва, В.В. Прыемка, Т.А. Марозава.– 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : БДУ, 2009. – 176 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ